# EUROMOOT PRAYER
# - BY -



**Малітва падрыхтоўкі да Еўрамут 2019**

**Добры Ойча, Крыніца жыцця**, Ты любіш усіх сваіх дзяцей і ведаеш імя кожнага з іх, адкрый нашыя сэрцы на незвычайнае братэрства, праз якое Ты паклікаў нас служыць адзін аднаму. Няхай наш рух і праект Еўрамут будуць мірным і прамяністым знакам гэтага братэрства для свету.

**Пане Езу, Валадар супакою**, Ты клічаш кожнага з нас *пайсці* за Табою і *ўбачыць*, дзе Ты жывеш, каб мы маглі жыць у Тваёй прысутнасці. Дай нам ласку пакінуць свае выгоды і свае ўпэўненасці, адкрый нам скарбы Свайго сэрца і запалі ў нас Твой агонь цярплівай і даверлівай любові на працягу ўсяго Еўрамуту і пасля яго.

**Дух Святы, Ойча бедных**, беражы нас ад усяго, што можа раздзяліць або перашкодзіць нам ісці за Хрыстом у нашай працы. Ты – сіла і лагоднасць, Ты злучаеш усіх людзей у радасці камуніі, будзь асновай нашай еднасці, кіруючай сілай нашай працы, каб яна прыносіла плён на Божую славу.

**Божая Маці**, каранаваная зоркамі, маліся за нас і вядзі нас!

Амэн